УДК 004.072:808.26

# СУЧАСНЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ

У. І. КУЛІКОВІЧ
Установа адукацыі
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»
Мінск, Беларусь

Якасць вучэбнага працэсу ў сучасных агульнаадукацыйных установах і ВНУ краіны залежыць ад многіх аспектаў, сярод якіх нема-лаважную ролю адыгрывае кампетэнтнасць выкладчыка і яго ўменне ўка-раняць найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі, што дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць аўдыторны і па-за аўдыторны час для правядзення, пад-рыхтоўкі і аналізу лекцыйных, практычных і семінарскіх заняткаў.

Задача артыкула — пазнаёміць з электронным вучэбным дапаможнікам «Беларуская арфаграфія».

Электронны раздзел “Арфаграфія” з’яўляецца част-кай курса “Беларуская мова”. Аўтар зместу — У. І. Куліковіч, тэхнічнае суправаджэнне і распрацоўка — выдавецтва «Новое знание». Гэта першае ў Беларусі выданне, якое мае наступныя асаблівасці.

1. Адрасавана шырокай аўдыторыі карыстальнікаў. У залежнасці ад мэты, задач, жадання ўдасканальвацца матэрыял, які прайшоў апрабацыю ў многіх студэнцкіх і школьных аўдыторыях, могуць выкарыстоўваць настаўнікі, выкладчыкі, студэнты, вучні, супрацоўнікі рэдакцыйна-выдавецкіх устаноў і арганізацый, усе зацікаўленыя ў павышэнні сваёй граматнасці асобы.

2. Зразумелы інтэрфейс і прастата ў выкарыстанні. Для таго, каб стаць удзельнікам працэсу навучання, неабходна: а) мець доступ у сетку інтэрнэт; б) зарэгістравацца ў сістэме **vedy.by**, пасля чаго адкрыецца асабісты кабінет для працы з сістэмай (Відарыс 1); в) выбраць рэжым працы (вывучэнне канкрэтнай тэмы або праверка ведаў па ўсім курсе беларускай мовы) і пачаць паглыбляцца ў матэрыял.

3. Шырокі дыяпазон рознаўзроўневых заданняў па кожнай канкрэтнай тэме: трэніровачныя (для арганізацыі працы ў аўдыторыі), кантрольныя работы (для кантролю за самастойнай працай навучэнца), заліковыя тэсты (для хуткай ацэнкі засваення пройдзенай тэмы) (Відарыс 2).

4. Наяўнасць карысных функцый: а) статыстыка і ацэнка выканання заданняў па канкрэтнай тэме і па ўсім курсе; б) магчымасць хуткага пошуку адпаведнага пункту правіла пры выкананні ці праверцы заданняў (пры націсканні на пытальнік, які стаіць пасля кожнага слова з арфаграмай, праграма аўтаматычна адкрывае старонку з патрэбным арфаграфічным законам; в) статыстыка найбольш частых памылак аднаго карыстальніка і

рэкамендацыі сістэмы па іх выпраўленні; г) статыстыка памылак усіх карыстальнікаў, што дазволіць устанавіць найбольш складаныя правілы і падчас навучання звяртаць больш увагі на іх змест, практычнае прымяненне.

Відарыс 1




Відарыс 2




Прапанаваная сістэма навучання арфаграфіі толькі пачынае сваё жыццё. Яна адкрывае шырокія магчымасці для рэалізацыі творчага патэнцыялу настаўніка і вучня, спрыяе павышэнню якасці навучання, эканоміі працоўнага часу выкладчыка, дазваляе арганізаваць вучобу і кантроль ведаў на адлегласці.